ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 86 (1053) | НЯДЗЕЛЯ, 13-га красавіка 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

ШМАТТЫРАЖНЫ ДРУК—МАГУТНЫ ВАГАР У МОБІЛІЗАЦЫІ ЭНЭРГІІ ПРАЦОЎНЫХ НА ВЫКАНАНЬНЕ БАЯВЫХ ПАРТЫЙНЫХ ЗАДАЧ

Прывітаньне ўсебеларускай нарады рэдактароў шматтыражных фабрычна-заводзкіх газэт ЦК КП(б)Б і яго ЦО „Зьвязьдзе“

Першая нарада рэдактароў фабрычна-заводзкіх шматтыражных газэт Беларусі шле палкае пролетарскае прывітаньне організатару і кіраўніку социялістычнага будаўніцтва Беларусі, непахіснаму праваднiку генэральнай лініі партыі—Цэнтральнаму Камітэту КП(б)Б і яго Цэнтральнаму органу „Зьвязьдзе“.

Зараз краіна ўступіла ў адзін з важнейшых, адзін з адказьнейшых этапаў социялістычнага будаўніцтва, які патрабуе максымальнай згуртаванасьці шэрагаў КП(б)Б, найбольшай напружанасьці, энэргіі і сіл пролетарыяту з тым, каб выканаць грандыёзьнейшыя задачы па індустрыялізацыі краіны, колектывізацыі сельскай гаспадаркі, будаўніцтве нацыянальнай пролетарскай культуры.

Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі бальшавікоў рабочая кляса Беларусі дабілася вялізарнейшых посьпехаў.

Растуць новыя прамысловыя гіганты. Гудкі магутных электрастанцый будзяць вякамі спаўшыя нэтры.

Ахопленыя хваляй соцыялістычнага спаборніцтва—ударніцтва рабочыя масы паказваюць нябачаныя дагэтуль тэмпы соцыялістычнага будаўніцтва, прыклады комуністычных адносін і організацыі працы.

Батрацтва і бедната ў саюзе з серадняком пад кіраўніцтвам пролетарыяту і яго бальшавіцкай партыі вышлі на шырокі шлях суцэльнай колектывізацыі і на аснове ліквідацыі кулацтва, як клясы. Рушацца векавыя ўстоі дробнаўласьніцкай гаспадаркі, трактарныя калёны зьнішчаюць старыя межы, зьнішчаюць цемру і ўбоства старой вёскі.

Пасьпяховае і поўнае выканьне задач, якія вымагаюцца пяцігадовым плянам, вырашэньне задач соцыялістычнай перабудовы вёскі, замацаваньне існуючых колгасаў, далейшае рашучае выкарчоўваньне рэшткаў капіталістычных элемэнтаў у вялікай меры залежыць ад таго, наколькі **энэргія, сіла** працоўных будуць мобілізаваны для ўпартай работы на рашаючых—складаных вучастках вялікага соцыялістычнага будаўніцтва, наколькі ўся наша праца будзе прасякнута бальшавіцкай самакрытыкай.

Добра ўсьвядоміўшы ўсю велічыню і адказнасьць стаячых задач, поўна разумеючы вагромністую ролю савецкага друку ў галіне мобілізацыі энэргіі мас на вырашэньне важнейшай зараз задачы—выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі, мобілізацыя мас на непрымірымую барацьбу з адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі—з правым ухілам, як галоўнай небясьпекай і „левымі“ загібамі, концэнтруючы адначасова агонь на самым небясьпечным зараз—нацыянал-дэмократызьме і шовінізмах усіх колераў, рашуча змагаючыся з скажэньнямі партыйнай лініі і перагібамі ў колгасным будаўніцтве, бязьлітасна б'ючы па шкодніцтву, бюрократызму, чыноўніцтву, рвацтву—першая нарада рэдактароў фабрычна-заводзкіх шматтыражных газэт—**запэўнівае ЦК КП(б)Б, што пастаўленыя задачы перад шматтыражкамі яны па прыкладу ЦО ЦК КП(б)Б «Зьвязды» пабальшавіцку выканаюць.**

Няхай жыве непахісны праваднік генэральнай ленінскай лініі партыі ЦК КП(б)Б!

Няхай жыве яго баявы орган „Зьвязда“!

Адкрылася 1-ая усебеларуская нарада рэдактароў шматтыражных фабрычна-заводзкіх газэт

Учора а 7 з пал. гадзіне вечары адкрылася 1-я ўсебеларуская нарада рэдактароў шматтыражак, сумесна з рэдкалегіямі насьценгазэт, рабкорамі гаспадарнікамі, і профпрацаўнікамі.

У прэзыдыум нарады абраны т. т. Сянькевіч, Будзінскі, Паскабойнікаў, Асьмоў, Джэнок, Шастакоў, Якаўлеў, Шокбіні.

Нарада абрала ганаровы прэзыдыум у складзе т. т. Сталіна, Молатава, рэдкалегіі газэты „Праўда“, Бюро ЦК КП(б)Б і Прэзыдыум ЦКК КП(б)Б.

Ад імя ЦК КП(б)Б нараду вітаў т. Сянькевіч.

Нарада паслала прывітаньні: ЦК УсеКП(б) і яго органу «Правда», друку компартыі Заходняй Беларусі, ЦК КП(б)Б і «Зьвязьдзе».

Буйнейшы польскі палітык Роман Дмоўскі апублікаў артыкул, у якім ён выкрывае падрыхтоўку вайны супроць СССР.

Польская ваешчына нагла заяўляе, што не пашкодзіла-б „паўтарыць вопыт налёту на Кіеў па прыкладу 1920 году“...

(З газэт).



Блізка локаць, ды ня ўкусіш.

Дэмонстрацыя ў Гамбургу

БЭРЛІН, 11. У ваколіцы Гамбургу дэмонстрацыя рабочай моладзі была разагнана паліцыяй. Арыштавана чацьвёра рабочых і некалькі праходзячых. У Мюнхэне арыштавана 28 рабочых.

Забастоўка парыскіх будаўнікоў

ПАРЫЖ, 11. Арыштавана 5 бастуючых рабочых будаўнікоў. Арыштаваныя—члены забастовачнага пікету—імкнуліся зьняць з работы штрэйкбрэхераў на адной з пабудоў. Лік бастуючых будаўнікоў у Парыжы перавысіў 9 тысяч чалавек.

Процэс украінскай контр-рэволюцыі

Грамадзкі абвінаваўца зазначае, што члены СВУ гатовы былі ператварыць Украіну у „сыр'явы дадатак суседнім дзяржавам“, абы толькі пазбавіцца ад савецкай улады

ХАРКАЎ, 12.—На працэсе СВУ пасьля грамадзкага абвінаваўцы тав. Любчака выступіў другі грамадзкі абвінаваўца—пісьменьнік Сьлесарэнка.

Значэньне процэсу—сказаў ён,—заключаецца ў тым, што ён адбываецца у момант найбольшага напружаньня будаўніцтва соцыялізму на Украіне і ва ўсім Саюзе, у момант абвастрэньня клясавай барацьбы. Сваю контр-рэволюцыйную работу СВУ разьлічвала прыкрыць нацыянальным сьцягам—патрабаваньнем мнімай „самастойнасьці Украіны“.

Аднак, у сапраўднасьці гэта быў толькі фігавы лісток, і калі на судзе сарвалі гэты фігавы лісток „самастойнасьці“, дык адкрыўся сапраўдны твар клясавага ворага, твар ваінствуючага контр-рэволюцыйнага кулацтва у авангардзе якога была нацыялістская буржуазная інтэлігенцыя.

На судзе высьветлілася, што пасьля Кастрычніка, цэнтр імкненьняў украінскай буржуазнай інтэлігенцыі усіх тых акадэмікаў, профэсароў і папоў, якія уваходзілі ў СВУ і дамагаліся нізрынуцьця савецкай улады і ўстанаўленьня буржуазнага ладу на Украіне. Такім чынам, вы судзіце тут агентаў кулака, пана і папа. Вы судзеце агентаў сусьветнай рэакцыі, якія імкнуліся павярнуць назад кола гісторыі.

Грамадзкі абвінаваўца зазначае, што члены СВУ гатовы былі ператварыць Украіну у „сыр'явы дадатак суседнім дзяржавам“, абы толькі пазбавіцца ад савецкай улады. Яфрэмаўцы нічога ня мелі супроць таго, каб прадаць інтарэсы шырокіх украінскіх мас і нават украінскую культуру польскай, расійскай, альбо якой-небудзь іншай буржуазіі, толькі-б нізрынуць уладу рабочых і сялян. Яны былі ня толькі ворагамі савецкага ладу, але і украінскай культуры. СВУ імкнулася зрабіць украінскую культуру падгалоўкам польскай і рускай буржуазіі. Экономічная Украіна па програме СВУ павінна была стаць сыр'явой базай Польшчы і іншых дзяржаў. Шырокае будаўніцтва украінскай пролетарскай культуры, дзесяткі тысяч украінскіх школ, хат-чытален, тэатры, кніжкі—усяго гэтага ня хоча бачыць асьцервянелы кулак і яго агент. За свае дзесяціны ён гатоў прадаць ня толькі Галіцыю, Буковіну, Закарпацьце, але і усю Украіну, ператварыцца нават у мала-паляка, альбо у мала-румына. абы толькі яго хўтар быў адгароджан высокім тынам і быў недатыкальным.

Пад жалезнай пятой

Габінэт Брунінга ўнасіць у рэйхстаг фінансавы плян, які прадугледжвае зьмяншэньне дапамогі беспрацоўным соцыял-дэмократы падтрымліваюць гэты плян.

(З газэт).



Соцыял-дэмократ:—Пацярпі, мілы... бачыш, я ўжо знайшоў цьвёрдую глебу для твайго падтрыманьня.

3.278.000 беспрацоўных

БЭРЛІН, 10. Па офіцыйных вестках агульная колькасьць беспрацоўных на ўсіх біржах працы на 15 сакавіка складае 3278000 чал.

Сплаў--важны фронт гаспадарчага будаўніцтва

Сплаў загатоўленага лесу—бязумоўна адказьнейшы фронт нашага соцыялістычнага будаўніцтва. На гэты фронт павінны быць кінуты значныя сілы.

Але мы прымушаны констатаваць, што на гэтым фронце ёсьць небясьпека. Адпаведныя організацыі не выкарыстоўваюць усіх магчымасьцяй для наглядваньня пасьпяховай працы па сплаву. Аб гэтым яскрава гаворыць той факт, што 12-га красавіка з раёнаў сплаву тэлеграфна павінны былі паведаміць Лесбел аб ходзе сплаву, але весткі прыслаў толькі адзін Барысаўскі раён.

Астатнія раёны маўчаць. У Лесбеле толькі разводзяць рукамі:

— Хто іх ведае, як там у іх—у нізох ідзе праца... Не інформуюць, хаця на месцы высланы людзі“. Лесбел ня ў курсе спраў па сплаве лесу ў раёнах.

Барысаўскі раён праз тэлеграф паведамляе, што ў іх да сплаву маецца матар'ялу 523.277 куб.мэтр. дроў—124.419 куб. мэтраў, з іх на 10-ае красавіка зьвязана 136.410 кубамэтраў, з зьвязаных-жа сплаўлена—101.310 куб. мэтраў. З дроў 280 куб. мэтраў адпраўлена суднамі і ўжо прыбыла на месца. З матар'ялу да канчатковых пунктаў прыбыло 4 тысячы кубамэтраў з выплавачных месц на чыстую воду—9.200 кубамэтраў.

Рабочых па вязцы маецца 2497 чалавек і 489 чалавек па сплаве. Не хапае 1000 чалавек.

Халопенішкае спажывецкае таварыства не завозіць на пункты сплаву прадуктаў харчаваньня і прамтавараў.

Толькі зараз Барысаўскае аддзяленьне Лесбелу прыступіла да пабудовы 3-х дамоў для рабочых. Культурным абслугоўваньнем сплаўшчыкаў не займаюцца. У саюзе гавораць, што ў такім-та месцы маецца маторная лодка з кіно-перасоўкай, у такім-та месцы мяркуецца набыць некаторае абсталяваньне, але саюз ня ведае, што конкрэтнага зроблена і што робіцца.

Комсамольская організацыя таксама не ўдзяляе гэтай важнай справе належнай увагі. Напрыклад, Гомельскі АК комсамолу толькі 2-3 дні таму назад зацьвердзіў плян працы сярод сплаўшчыкаў.

Належным організацыям неабходна неадкладна зьнішчыць маючыяся перашкоды. Сплаў лесу павінен прайсьці як належыць.

Ц. В.

Імпэрыялістыя рыхтуюць вайну супроць СССР

Польскія фашыстыя адкрыта пагаварваюць аб узброеным нападзе на Савецкі Саюз

У апошнія дні пасьля роспуску сойму і прызначэньня палкоўнічага габінэту, у Польшчы наступіла паласа некаторага політычнага зацішша. Урад захоўвае ўпартае маўчаньне аб сваіх бліжэйшых плянах.

Гэта зацішша, аднак, носіць чыста надворны характар. Па сутнасьці, у польскіх політычных колах пануе абсолютная дэзорыентацыя і поўнае няўпэўненасьць у заўтрашнім дні. Політычная беспэрспэктыўнасьць, якая зьяўляецца характэрнейшым момантам нэо-палкоўнічага пэрыоду, спараджае ў шырокіх колах шэраг трывожных настрояў, зьвязаных асабліва з знадворна-політычнымі пытаньнямі.

Тэма аб магчымасьці провакацыі вайны становіцца надзвычайна-вострай, гэтаму пытаньню прысьвяціў вялікі артыкул адзін з буйнейшых і надта асьцярожных польскіх політыкаў—заснавальнік нацыянал-дэмократыі, Роман Дмоўскі.

У сваім артыкуле Дмоўскі падкрэсьлівае, што ў плянах падрыхтоўкі вайны супроць СССР разьлікі на Польшчу граюць рашаючую ролю.

— Пры сустрэчах з прадстаўнікамі гандлю, прамысловасьці і фінансаў у Эўропе, — піша Дмоўскі, усё часьцей можна чуць ваенныя лёзунгі, патрабаваньні крыжовага паходу супроць Савецкага Саюзу і завяральныя паведамленьні, што такі паход ужо вырашан на нейкай нарадзе фінансістых і,—што вельмі паказальна — ініцыятары вайсковых плянаў **разьлічваюць ня толькі на зьнішчэньне савецкага ладу, але і на падзел Расіі між буйнымі і нават дробнымі дзяржавамі.** Але эўропэйскія народы, працягвае Дмоўскі,—ня надта хочуць вайны, бо памятуюць лішчэ сусьветную вайну, З другога боку, эўропэйскія урады маюць шмат клопату са сваімі ўласнымі комуністымі і памятаюць, што ў выпадку вайны супроць СССР маглі-б стварыцца вялікія цяжкасьці. Аднак,ваяўнічыя фінансістыя не зьяўляюцца такімі нерэальнымі політыкамі. Свае ўласныя дзяржавы яны ня думаюць уцягнуць у вайну. Іх ідэя—дарычыць гэтыя опэрацыі Польшчы. Аб гэтым фінансістыя гавораць зусім адкрыта.

— „Чым,—пытае Дмоўскі,—ініцыятары вайны спакушаюць Польшчу? Яны абяцаюць пры падзеле Расіі аддаць Польшчы **землі за Збручам**“. Фінансістыя ў прыватных размовах гавораць аб гэтым зусім сур'ёзна. Акрамя таго, Польшчы даюць зразумець, што на вядзеньне вайны яна атрымае пазыку, зразумела, на даволі добрых процантах. Словам, сусьветны коммівояжэр **гатоў ваяваць ... апошняй кроплі крыві... польскага салдата.** „У Польшчы,—кажа далей Дмоўскі,—шырокія колы аб гэтых плянах амаль ня чулі. А калі і чулі, дык лічаць іх фантазіяй. Шырокія колы ня маюць падазронасьці, што на Захадзе за кулісамі гавораць аб гэтым надзвычайна многа і ня толькі фінансістыя, але і політыкі. Нарэшце, кожны хто ўважліва чытае газэты павінен быў заўважыць пляны анты-савецкай кампаніі ва ўсіх краінах“.

* * *

Сьцьвярджэньне Романа Дмоўскага—сьцьвярджэньне аўтарытэтнае. Роман Дмоўскі, які падпісаў у свой час ад імя Польшчы Вэрсальскі дагавор, занадта буйны і прызнаны політык, каб кідаць словы на вецер у пагоні за каштоўнымі публіцысцкімі эфэктамі. Яго вялізарныя сувязі з Заходня-Эропэйскім політычным сьветам служаць, акрамя таго парукай шматбаковасьці і непасрэднасьці тэй інформацыі, якой карыстаецца ён для вызначэньня маштабу анты-савецкай падрыхтоўкі, якая праходзіць за эўропэйскімі політычнымі кулісамі. Польскія кіруючыя колы, па адрасу якіх напраўлены артыкулы Дмоўскага, абходзяць пакуль гэтыя артыкулы маўчаньнем. У абставінах, якія зараз перажывае Польшча, гэта маўчаньне мабыць ня менш красамоўна, чым перасьцерагаючае выступленьне заснавальніка польскай нацыянал-дэмократыі.

Да гадавіны соцспаборніцтва

УДАРНЫЯ БРЫГАДЫ ПАТРАБУЮЦЬ:

УВАГІ КІРАЎНІЦТВА З БОКУ ПАРТЫЙНЫХ, ПРОФЭСЫЙНЫХ І АДМІНІСТРАЦЫЙНЫХ ОРГАНІЗАЦЫЙ, ПАТРЭБНЫХ УМОЎ ДЛЯ НОРМАЛЬНАЙ ПРАЦЫ, ПОЎНАГА ЗАБЯСПЕЧАНЬНЯ НЕАБХОДНЫМІ МАТАР'ЯЛАМ І ІНСТРУМАНТАМІ

Без выкананьня гэтых патрабаваньняў немагчыма пасьпяховае выкананьне прамфінпляну

33 УДАРНЫЯ

33 ударныя брыгады былі створаны за кароткі час на фабрыцы „Адраджэньне". Большасьць не на словах, а на справе паказалі сваё ўдарніцтва. На чырвонай дошцы дзень у дзень замільгацела зьніжэньне на 7, 10, 15, 23 і нават больш процантаў. Вытворчасьць працы паднялася ў брыгадах да 35 і больш процантаў. Ліцейны цэх абвясьціў сябе поўнасьцю ўдарным.

На фабрыцы працуе ў большасьці моладзь; з яе складаецца большасьць ударных брыгад. Але каля 60 проц. рабочай моладзі было пакінута за бартом. Цэхі, якія напэўна маглі быць ударнымі, дзякуючы недастатковай растлумачальнай і організацыйнай працы, гэтага не зрабілі.

Да гадавіны соцспаборніцтва комсамольская ячэйка ўзяла рэзкі курс на перавод фабрыкі ва ўдарную. Красавік месяц абвешчан ударным. Двое лепшых ударнікаў будуць вылучаны на гаспадарчую працу. Наладжваецца вечар рапартоў ударных брыгад. Зараз у нас паменшыўся лік ударных брыгад, бо частка фабрыкі адышла ад нас, але ў бліжэйшы час ёсьць усе паказчыкі за тое, што фабрыка „Адраджэньне" поўнасьцю пераключыцца на ўдарныя рэйкі.

А. Сладзін.

На акулярнай глядзяць скрозь рагавыя акуляры

На 159612 рублёў Віцебская акулярная фабрыка ў першым квартале 1929-30 гаспадарчага году недавыпусьціла гатовай прадукцыі.

У другім квартале наглядаем некаторы зрух—плян быў выканан на 99,1 проц.

Каб перавыканаць плян, каб ліквідаваць прарыў, які меўся ў першым квартале, каб зьвярнуць фабрыцы званьне ўдарнай фабрыкі—гэтым на працягу другога кварталу ніхто ня цікавіўся і не клапаціўся, і ў выніку—плян за 6 месяцаў выкананы на 86,6 проц., г. значыць за 6 месяцаў фабрыка недавыпусьціла гатовай прадукцыі на 170600 рублёў.

99,1 проц., ад якіх закружылася галава ва ўсіх організацый фабрыкі, далека ня могуць радаваць, бо... за другі квартал рабочая сіла павялічылася на 17 проц., г. зн. на 60 чалавек.

на 13 проц., а за паўгода—на 26 проц.

Вялікае месца займаюць на фабрыцы прастоі; асабліва яны маюць месца ў рабоце вячэрняй зьмены. Многія машыны ў свой час не рамантуюцца, ад чаго прыходзіцца плаціць рабочым за прастой.

Соцспаборніцтва, ударніцтва на сёньнешні дзень вельмі слаба прывіваліся. З 460 рабочых, якіх налічваецца на фабрыцы, толькі 112 састаяць ва ўдарных комунах і 33 індывідуальна ахоплены соцспаборніцтвам.

Партыйная праслойка ў брыгадах-комунах вельмі мізэрная.

З 70 партыйцаў толькі 13 састаяць ва ўдарных комунах і 9 ахоплены індывідуальным спаборніцтвам. Комсамольцы таксама далёка ня ўсе ахоплены комунамі. Так, з 55 комсамольцаў 24 састаяць у комунах і 12 ахоплены індывідуальным спаборніцтвам.



— У нас ўсё добра-а-а-а..

Дзякуючы гэтай рабочай сіле, якая ўлілася на фабрыку, на працягу апошніх трох месяцаў (2-гі квартал) фабрыка дабілася такіх „шпаркіх тэмпаў", ад якіх у „трыкутніка" і комсамольскай ячэйкі атрымалася „галавакружэньне ад посьпехаў".

Па асобных цэхах выкананьне прамфінпляну характарызуецца наступным чынам: забясьпечны цэх выканаў на 100,54 проц., шліфавальны — 96,7 зборачна-оптычны толькі на 66 і цэлюлёідны—на 45,32 проц.

З гэтага відаць, што ганебна адстаюць зборачна-оптычны і цэлюлёідны цэхі. Плян па апошняму (цэлюлёіднаму) цэху часткова ня выкананы з прычыны адсутнасьці сыравіны. Але чаму так ганебна адстаюць зборачна-оптычны і шліфавальны цэх? Тут, здаецца, і сыравіны хапае і іншых „об'ектыўных прычын" ня было. Усё-ж такі ў чым тут справа? У чым прычыны ганебнага адставаньня ўсёй фабрыкі ад патрэбных тэмпаў.

А справа вось у чым: вытворчасьць працы замест 52 проц., якія былі намечаны прамфінплянам у першым квартале, узьнята толькі

Паміж адданых вытворчасьці брыгаднікаў-комунараў маюцца і такія, якія падрываюць работу комун, зьніжаюць інтэнсыўнасьць працы і г. д.

Гэтымі днямі адна з брыгад-комун выключыла комсамольца Кушэль С., які сваімі паводзінамі разлагаў комуну.

Мінулы склад фабкому не правяраў работы ўдарнікаў, не кіраваў імі. Партыйная і комсамольская ячэйкі таксама стаялі ў баку ад кіраўніцтва жыцьцём фабрыкі і таму ўтварылася такое становішча, аб якім мы вышэй пісалі.

Адгэтуль—безадкладная задача ўсіх організацый фабрыкі—на працягу бліжэйшых месяцаў ахапіць ударніцтвам ня толькі ўсіх партыйцаў і комсамольцаў, але і рэшту рабочых; ліквідаваць прарывы першага паўгодзьдзя і пайсьці ўперад па шляху выкананьня пяцігодкі ў 4 гады.

Гэтага можна будзе дабіцца толькі пры актыўным удзеле ўсіх рабочых фабрыкі.

Ударнікі па... загаду

У майстэрні Белрадыёцэнтру социялістычнае спаборніцтва зусім не праводзіцца, ня гледзячы на тое, што пытаньне аб ім некалькі раз стаяла на агульных і цэхавых сходах.

Організатарам ударніцтва была адміністрацыя. Вось, як гэта здарылася. Аднойчы прышоў загадчык майстэрні і, прачытаўшы сьпіс брыгад, абвясьціў іх ударнымі. Ня трэба дзівіцца, што вынікі такога ўдарніцтва былі самыя дрэнныя — зараз ударніцтва зусім няма.

Падвышэньне вытворчасьці працы адбываецца за кошт працы ў выхадныя дні і непрацоўны час. Расхлябанасьць і неорганізаванасьць працы кладзе свой адбітак на колькасьць і якасьць продукцыі. Лаянка і хуліганства ў час працы — звычайныя зьявы.

На далейшы час такое становішча майстэрні немагчыма. Б'ем трывогу.

Р. К.

Аб першых і апошніх

На фанэрным заводзе фабрыкі «**Вэзуві**» існуе 30 ударных брыгад, але з імі ніякай работы не вядзецца. Брыгадзіры ня ведаюць аб сваіх правох. Назіраюцца нядбайныя адносіны некаторых брыгадзіраў да сваёй працы. Старэйшы брыгадзір **Фэршт**, з прычыны сваёй нядбайнасьці, дапусьціў ціск стрэлкі маномэтру звыш указчыка на 400 атмосфэр, тады як не дазваляецца звыш трохсот, такі ціск мог-бы прывесьці да аварыі буйнага гідраўлічнага прэсу. Выпускаемы поўфабрыкат зьмяшчае ў сябе шмат браку. З другога сорту атрымліваецца трэці і чацьверты таму, што на фанэры ўзьнікае шмат паўхіроў. За пяць дзён працы было выпушчана 1203 лісты фанэры з паўхірамі, дзякуючы таму, што прасоўшчыкі гоняцца за вялікім заробкам і з-за колькасьці продукцыі забываюць аб яе якасьці.

Сушчыкі сушыльных прэсаў таксама стараюцца зрабіць паболей зваротаў каб больш зарабіць, але з-за гэтага атрымоўваецца зноў дрэнная якасьць продукцыі.

Выпускаюць недасушаную фанэру, пасьля чаго прыходзіцца прывозіць са складу гатовы фабрыкат і зноў прасушваць яго. Малы сушыльны прэс патрабуе добрага рамонту, але мэханік **Мядзьвядзеў** адкладвае са дня на дзень. Пяць пліт зусім не працуюць, за суткі складае 600 лістоў выпрацаванай фанэры.

Маюцца на фанэрным заводзе добрыя ўдарныя брыгады, якія апраўдваюць сваё званьне. Некаторыя брыгады самі зьнізілі расцэнкі. Аўтоматная цыркулярка, карыстаючы розным рацыяналізатарскім захадам, зьнізіла расцэнкі на ... процантаў.

Комплектавая цыркулярка раней выпрацоўвала 14000 лістоў, а ... раз выпрацоўвае 18 тысяч лістоў, зьнізіўшы расцэнкі на 16 пр... Гэта адна з ударных брыгад, якая сапраўды зьяўляецца паказальнай.

Удзельнік юнкораўскай брыгады

Д. Гурар'е...

Брыгада распалася

Соцспаборніцтва і ўдарніцтва на люстэрнай фабрыцы пры Менгаркоме не адчуваецца. Месяцы два таму назад была абрана вытворчая камісія, якая зрабіла адно падсэджаньне, намеціла цэлы шэраг пытаньняў, але яны засталіся толькі на паперы, таму што кіраўнікі фабрыкі ня выконваюць пастановы камісіі, ня гледзячы на тое, што яны з імі былі згодны.

Нядаўна па ініцатыве некаторых рабочых была організавана ўдарная брыгада з 6-ці чалавек, якая выклікала на спаборніцтва ... ны цэх і астатніх рабочых свайго цэху, але выкліканыя не адгукнуліся і ўдарная брыгада распалася.

Зараз набліжаецца гадавіна спаборніцтва. Наша фабрыка мае ніякіх посьпехаў і паказчыкаў да гэтай гадавіны. Трэба на... стаць упушчанае.

Блакітны...

„Ударніцтва" Гірыных

Комсамольцы ячэйкі транспартнага трэсту вельмі дрэнна адносяцца да сваёй працы на вытворчасьці. Комсамолка **Гірына** ўступіла ў спаборніцтва з **Ясенкам** па прагулах і спазьненьнях на працы. З першага дня сваёй „ударнай" працы яны дагналі і перагналі ўсіх рабочых. Калі **Ясенка** зробіць спазьненьне на адну гадзіну, дык **Гірына** на дзьве. Калі **Ясенка** на дзьве, дык **Гірына** зусім ня прыдзе на работу. Аб комсамолцы **Гірынай** пісалася ў насьценгазэце „**У руля**", як аб шкодніцы, але гэта не памагло. Яна абзывае едучых у трамваі рознымі мянушкамі, груба адносіцца да пасажыраў.

Я лічу, што такой ударніцы ня месца ў комсамоле і на прадпрыемстве. Комсамолка **Кімэльман** працы адносіцца з прахладцай, ўцякае з працы разам з бронь... нямі а трэцяй гадзіне.

Гнаць трэба гэткіх ілжэ-ударнікаў з нашых шэрагаў, каб астатняя маса комсамольцаў магла сапраўды стаць на чале беспартыйнай моладзі ў справе соцспаборніцтва.

Бор-Машын...

Вучэцеся ў гарадзкой Гомельскай

29 красавіка—гадавіна соцыялістычнага спаборніцтва. Для таго, каб падсумаваць к гэтай гадавіне ўсе дасягненьні абвешчанага соцспаборніцтва, комсамол сумесна з ЦСПС і ВСНГ прыступілі да самаправеркі выкананьня прамфінпляну і дагавораў па соцспаборніцтву.

Комсамол і рабочыя прыступілі да гэтай работы. Але яшчэ не паўсюды гэта праца праходзіць як належыць. Возьмем для прыкладу Гомельскую акруговую комсамольскую організацыю Тут толькі комсамольская організацыя гарадзкога раёну як належыць разгарнула працу. Усе практычныя мерапрыемствы былі дакладна прапрацаваны раённым штабам, які шырока разгарнуў работу па самаправерцы на прадпрыемствах. Напрыклад, на фабрыцы імя Клары Цэткін організаваны патрулі ў два-тры чалавекі, якія прымацоўваюцца да кожнай брыгады. Задача патрулёў заключаецца ў тым, каб браць лічбы выпрацоўкі брыгады, да якой патруль прымацаваны.

У выніку гэтага праз кожныя два дні выходзяць сводкі ў насьценгазэце. Тут, як і на іншых прадпрыемствах гарадзкога раёну (акрамя хлебазаводу) шырока разгорнута работа па самаправерцы. У гэтай працы прымае гарачы ўдзел уся грамадзкасьць.

Але ня гледзячы на бясспрэчна добрую працу грамадзкасьці ў гэтай галіне, патрэбна падкрэсьліць і дрэнныя бакі. Гэтай працы перашкаджаюць няўвязкі паміж комсамольскімі колектывамі і профорганізацыяй.

На фабрыцы „Труд" сэкратар комсамольскага колектыву спрачаўся з старшынёй фабкому—каму адчыніць сход па самаправерцы, а каму зрабіць даклад на гэту тэму, бо адзін гаварыў, што праца па самаправерцы—гэта праца комсамолу, а другі, што гэта праца профорганізацыі. Але ня гледзячы на гэтыя „дробязныя" перашкоды, у гарадзкім раёне праца па самаправерцы ра горнута добра. Завод „Пролетары" рыхтуе паказальны суд на ілжэ-ударнікамі і няўдарнікамі.

Затое ў іншых раёнах справа абстаіць дрэнна. У Залінейным раёне па самаправерцы не працуюць, як належыць. На заводзе імя Ланцуцкага (буйнейшы завод Залінейнага раёну) у справе соцспаборніцтва няма належнага зруху. У комсамольскай організацыі заводу няма жывасьці ў гэтай рабоце.

НАОГУЛ, У ЗАЛІНЕЙЦЫ КОМСАМОЛЬСКАЯ ОРГАНІЗАЦЫЯ НЕ ОРЫЕНТАВАНА Ў ПЫТАНЬНЯХ ГАДАВІНЫ.

Толькі апошнія дні, калі як належыць „націснулі" зьверху, калі аб заводзе імя Ланцуцкага сталі зьяўляцца трывожныя артыкулы ў „Чырвонай Зьмене і ў „Палескай Праўдзе", завком за воду пачаў сяк-так раскачвацца. Завком зьняў з працы 6 вучняў ФЗВ і вучобы для пісаньня лёзунгаў і плякат(!?)

У РЭЧЫЦКІМ, НОВАБЕЛІЦКІМ, ДОБРУСКІМ раёнах справа абстаіць ня лепш. Сэкратар Нова-Беліцкага райкому комсамолу т. С... кер сказаў:

— „У нас толькі пляны, а крэтных спраў яшчэ няма".

Яшчэ горш абстаіць справа з сельскімі раёнамі. АК комсамолу ня ведае, як праходзіць у ... скіх раёнах праца па гадавіне соцспаборніцтва. Сэкратар АК Рубін па гэтаму пытаньню к... —„Я лічу, што нашы даўно ... ныя дырэктывы яшчэ знаходзяцца ў дарозе ад РК да ячэек".

У ГОМЕЛЬ-СЕЛЬСКІМ раёне комсамольскія ячэйкі толькі-толькі пачалі разгортваць працу, ідуць ім насустрач, нават, бо гэтага,—Райком партыі адмовіўся заслухаць інформацыю аб гадавіне соцспаборніцтва, бо, бачыце, ёсьць „больш важныя пытаньні".

Неабходна падкрэсьліць, для справы самаправеркі да гадавіны соцспаборніцтва ячэйкі не скарыстоўваецца ў дастатковай меры „Чырвоная Зьмена" і не мобілізавана таксама „лёгкая кавалерыя".

ПРАЦА ГАРАДЗКОЙ КОМСАМОЛЬСКАЙ ОРГАНІЗАЦЫІ ВАРТА ПРЫКЛАДУ. ПА ГАРАДЗКОЙ ... ГАНІЗАЦЫІ ПАВІННЫ РАЎНЯЦЦА АСТАТНІЯ РАЁНЫ

Рыгор Праўдзі...

КОЛГАСЫ ВЫШЛІ Ў ПОЛЕ НА СЯЎБУ

...лгас „Ленінскі Шлях“ Клімаўшчыны ва ўсеўзброеньні выехаў у поле на ворыва, „Фрунзаўцы“ і „Чырвоная Зьмена“ ўпарта рыхтуюцца

Колгасы: „Краіна Саветаў“, „Вясеньняе Жыцьцё“, „Бязбожнік“ і „Пролетарыят“ сарвалі падрыхтоўку да сяўбы

РАЗГОРНЕМ МАСАВУЮ ПЕРАКЛІЧКУ КОЛГАСАЎ ПА ЛЕПШАЙ ОРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ І ПАДРЫХТОЎКІ ДА СЯЎБЫ. НА ВОПЫЦЕ ЛЕПШЫХ НАВУЧЫМ АДСТАЮЧЫХ І ВЫПРАВІМ ІХ ПАМЫЛКІ

Шырэй разгорнем пераклічку

Колгасныя ячэйкі, комсамольцы колгасьнікі і юнселькоры, памятайце: пераклічка—ваша ўдарная работа

1-га красавіка „Чырвоная Зьмена“ па выкліку ...омсамольскай Праўды“ уключылася ў правядзеньне масавай пераклічкі комсамольскай організацыі па ...ганізацыі працы ў колгасах.

Надаючы вялікае значэньне гэтаму найважнейшаму мерапрыемству, ЦК ЛКСМБ даў з свайго боку ...азаньні ўсім камітэтам і ячэйкам аб разгортваньні ...савай працы на мясцох і практычнай організацыі ...раклічкі паміж ячэйкамі і колгасамі.

Але на сёньня мы прымушаны констатаваць ...чынную непаваротлівасьць на мясцох і недастат...ае разуменьне нізавым комсамольскім кіраўніц...ам задач пераклічкі.

І як вынік няўважлівых адносін комсамольскага ...раўніцтва камітэтаў і ячэек, масы комсамольцаў ...выкананьне гэтага мерапрыемства не мобілізава... Пастанова ЦК ЛКСМБ па гэтаму пытаньню не ...рымала належнага практычнага ажыцьцяўленьня.

Комсамольская-ж організацыя сваім удзелам у пе...клічцы павінна паказаць найлепшыя формы ўдзе... ячэек, шырокіх мас комсамольцаў і беспартыйнай ...гаснай моладзі ў організацыі працы ў колгасе і ...падняцьці вытворчасьці працы. Патрэбна поўнасьцю выкарыстаць пераклічку для перабудовы працы ...эек ў адпаведнасьці з задачамі колгасу.

Пачынаючы пераклічку, рэдакцыя „Чырвонай Зьмены“ адкрытым лістом зьвярталася да ўсіх камітэтаў, ячэек і комсамольцаў і юнселькораў прыняць актыўны ўдзел і ўзварушыць усю вясковую грамадзкасьць на практычны ўдзел у правядзеньні пераклічкі. Але гэта да сёньняшняга дня не дало дастатковых вынікаў.

Сёньня мы зноў зварочваемся да комсамольскіх камітэтаў, ячэек, комсамольцаў і юнселькораў па сапраўднаму мобілізавацца ўсёй сваёй масай да практычнага ўдзелу ў пераклічцы праводзячы працу пад лёзунгам: „няма ніводнага камітэту, ячэйкі, комсамольца, юнселькора, які-б ня быў актыўным організатарам практычнай працы па правядзеньню пераклічкі комсамольскіх ячэяк колгасаў“.

Трэба памятаць, што мы атрымаем вялікую карысьць ад пераклічкі толькі тады, калі ўся комсамольская организацыя і вясковая грамадзкасьць прыме актыўны ўдзел у асьвятленьні як дадатных, так і адмоўных бакоў у справе па організацыі працы ў колгасах.


Мы спадзяемся, што комсамольскія камітэты і ячэйкі ўлічаць прарывы ў гэтай працы і тэрмінова іх выправяць.

Колгасныя ячэйкі, комсамольцы-колгасьнікі і юнселькоры, мы чакаем ад вас матар'ялаў! **Пераклічка—ваша ўдарная задача.**

Міхась Ціхі.

Пачалася сяўба

У колгасе „Ленінскі Шлях“, Клімаўскі раён.



НА ЗДЫМКУ: зьверху—першы выхад у поле, унізе—трактарысты заводзіць матор трактара



Колгас „Краіна Саветаў“ сарваў сяўбу

...тароўская ячэйка комсамолу ...асу „Краіна Саветаў“, Сьміла...ага раёну, ніякай працы па ...цаваньню колгасу і падрых...ы да вясеньняй сяўбы не пра...іць.

...сяўбы засталіся толькі дні, ...лгас „Краіна саветаў“ зусім ...адрыхтаваны. Ня ўсё насень... ...багулена і ачышчана, сельска...адарчы інвэнтар яшчэ і не па...алі абагульняць і рамантаваць. ...а-цягавая сіла не абагулена і ...творана кармовая база на час ...ньніх пасеўных работ.

...род батрацтва і беднаты ячэй...адай зусім не вядзе працы. Групы беднаты не організаваны.

Сьмілавіцкаму райкому комсамолу патрэбна з усёй рашучасьцю ўзяцца за справу перабудовы працы ячэек па творчаму прынцыпу, пераключыўшы яе на выкананьне задач партыі па колектывізацыі, працы сярод беднаты і батрацтва і падрыхтоўцы да правядзеньня вясеньняй пасеўнай кампаніі. А колгас „Краіна Саветаў“ павінен зараз-жа ліквідаваць прарывы ў падрыхтоўцы да сяўбы з тым, каб ва ўсеўзброеньні сустрэць рашаючую вясну.

ШЫПІЛЬСКІ Міхась

...рыкладнасьць калгасу дае прыліу

Колгас „Савецкая Беларусь“, Сьмілавіцкага раёну, распа... падрыхтоўку да севу яшчэ ў студзені месяцы. Колгась... абагулілі ўвесь сельска-гаспадарчы інвэнтар, адраманталі ... абагулілі і ачысьцілі насеньне. Ва ўсёй гэтай працы ком...ольцы прымалі актыўны ўдзел. Зараз ячэйка прымае шэ... мерапрыемстваў па пашырэньню пасеў-плошчы на 12 пр. Дружная праца колгасьнікаў па замацаваньню і падрых...ы яго да вясеньняга севу дала штуршок бядняцка-серад...ім гаспадаркам і за апошні час наглядаецца вялікі пры... беднаты і серадняцтва ў колгас.

Колгасьнікі вынесьлі рашэньне адсьвяткаваць замест, вя...дня сьвята „першай баразны“, зрабіўшы першы выезд у по...а ворыва.

Юнкор ЧУБАР.

Жаброўскія комсамольцы сьпяць

...аброўская ячэйка комса...у (Меншчына) ніякай пра...па замацаваньню колгасу, ...рыхтоўцы яго да сяўбы і ...нізацыі працы не вядзе. ...гас да вясеньняга севу не падрыхтован. З 15 комсамольцаў толькі 3 чалавекі ўдзельнічаюць у працы колгасу. Праца з батрацтвам і беднатою ў колгасе не вядзецца.

Каліна.

Рудзенцы сарвалі сяўбу

Па шэрагу колгасаў Рудзенскага сельсавету, Сьмілаўскага раёну падрыхтоўка да вясеньняга севу сарвана. Асобныя колгасы нічога ня робяць па падрыхтоўцы. Колгас „Вясеньняе жыцьцё“ мае ўласны трыер, але насеньня яшчэ не ачысьціў, а з сельска-гаспадарчага інвэнтара адрамантаваў толькі 2 плугі. Колгас „Бязбожнік“ не абагуліў сельска-гаспадарчага інвэнтара і рабочае жывёлы, ня поўнасьцю абагуліў насеньне, чыстка якога ідзе надта марудна,—працуюць у адну зьмену, ачышчаючы ў суткі 1 цэнтнер. У колгасе „Пролетарыят“ трыер стаіць без работы на працягу двух месяцаў, ён так сама не падрыхтаваны да пасеўнай кампаніі.

Комсамольскія ячэйкі і сельсавет не заняліся справай праверкі падрыхтаванасьці колгасаў да сяўбы і організацыі ў іх працы.

М. Чубар.

Колгасы „Комсамолец“ і „Чырвоны Сьцяг“ гатовы к выхаду ў поле

Кастрычнікаўская ячэйка ЛКСМБ выслала брыгады ў Гацкі сельсавет для організацыйнага замацаваньня 2-х колгасаў: „Комсамолец“ і „Чырвоны Сьцяг“. Колгас „Комсамолец“ аб'яднае 25 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, а „Чырвоны Сьцяг“—23. Колгасьнікі, ня гледзячы на перашкоды кулакоў і іх падпявал, яшчэ больш згуртаваліся ў клясавай барацьбе. Зараз колгасы земляўпарадкаваны, ім адведзена поле пад яравы клін і ў першых лічбах красавіка яны выедуць у поле для праверкі сваёй падрыхтаванасьці да сяўбы.

Брыгады дапамаглі колгасьнікам праверыць падрыхтаванасьць сельска-гаспадарчага інвэнтара, прапрацавалі з імі новы статут сельска-гаспадарчай арцелі, на які перашлі колгасы.

К. Пч-кін.

Колгас „Чырвоная Зьмена“ ўпарта рыхтуецца да вясны

Колгас „Чырвоная Зьмена“ Сьмілавіцкага раёну з часу свайго заснаваньня пачаў упарта рыхтавацца да вясеньняй пасеўкампаніі. Сельска-гаспадарчы інвэнтар поўнасьцю абагулен і скончана рамантаваньне яго. Збожжа абагулена і ачышчана. Колгасьнікі зараз пачалі рамантаваць хлявы для абагуленай рабочай жывёлы. Праца колгасьнікамі праводзіцца з вялікім энтузіязмам, а гэта дае надзею, што задачы падрыхтоўкі да бальшавіцкай сяўбы будуць поўнасьцю выкананы.

Колгасьнік РЫСЯВЕЦ.

Ва ўсеўзброеньні сустрэнуць вясну

Колгас імя Фрунзэ, Талочынскага раёну ў поўнай баявой гатоўнасьці к выхаду ў поле. Колгас ачысьціў і абагуліў усё насеньне, адрамантаваў увесь абагулены ельска-гаспадарчы інвэнтар і машыны. Колгасьнікі разьбіты на брыгады, вылучаны брыгадзіры. Яны бадзёра працягваюць і далей рыхтавацца. Можна быць упэўненым, што пасеўная кампанія ў колгасе імя Фрунзэ пройдзе сапраўды па-бальшавіцку.

Але побач з пасьпяховай гаспадарчай падрыхтоўкай колгасу к сяўбе, зусім не вядзецца працы па падрыхтоўцы культурнага абслугоўваньня колгасьнікаў на час пасеўнай кампаніі. Памяшканьне, адведзенае пад чырвоны куток, не абсталявана, радыё маўчыць, а комсамольская ячэйка ў гэтым стасунку нічога ня робіць.

Трэба падцягнуць культурную работу і забясьпечыць культурным абслугоўваньнем колгасьнікаў на час палявое працы, падпарадкаваўшы ўсю культурную працу пасьпяховаму гаспадарчаму будаўніцтву ў колгасе.

Юнкор.

Галавацяпы зрываюць працу

22 бядняцка-серадняцкія гаспадаркі вёскі Зелянкова (Аршаншчына) уступілі ў колгас, але, дзякуючы галавацяпству кіраўніцтва колгасу, падрыхтоўка да сяўбы зрываецца. Колгасьнікі яшчэ не абагулілі насеньне, інвэнтар і працоўную жывёлу. Організацыя працы ў колгасе не праведзена і яшчэ да гэтага часу ён не землеўпарадкаваны, ня ведае, дзе яму будзе адведзена зямля для карыстаньня. Гэткае становішча падрыхтоўкі да сяўбы пагражае колгасу правалам правядзеньня севу. Адпаведным органам трэба прыняць рашучыя захады да галавацяпаў і тэрмінова выправіць прарывы.

Абложкін Сяргей.

Пра індывідуальныя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі забыліся

Падрыхтоўка да вясеньняй пасеўнай кампаніі ў індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках па шэрагу сельсаветаў Сьмілавіцкага раёну зрываецца. Сельсаветы да апошняга часу не заняліся пытаньнем падрыхтоўкі да сяўбы: няма пляну і не вядзецца працы па пашырэньню пасеўнай плошчы ў індывідуальных бядняцка-серадкіх гаспадарках.

Сьмілавіцкаму РВК неабходна прыняць тэрміновыя меры і прыцягнуць вінаватых за зрыў пасеўнай кампаніі па індывідуальнаму сэктару да адказнасьці.

КАЛІНА.



Колгасьнікі на воранi

Вялікі замежны паход лінкора „Парыская Комуна" і крэйсэра „Профінтэрн"

ЧЫРВОНЫЯ КАРАБЛІ У БРЭСЬЦЕ

(Ад нашага спэцыяльнага карэспондэнта)

Караблі Чырвонага флёту вышлі з гонарам пераможцамі стыхіі Асабовы склад гэроічна працаваў у цяжкіх ненармальных бытавых умовах. У працягу гэтых дзён мала хто прыплюснуў вочы і заснуў. Рэдкай і гарачай стравы ня было зусім. Спроба зварыць абед скончылася тым, што крупнік выліўся з катлоў. Чай расьпівалі з чайнікаў, якія былі падвешаны да столі і адначасна служылі крэнамэтрамі для чырвонафлётцаў.

У кают-кампаніі таксама прыладжваліся да абставін. Можна было бачыць як камандзіры трымаючыся нагамі за ножку стала, прывязанага да пераборак, уважліва займаліся консэрвамі. У моманты, калі вада ня так шалёна штурмавала карабель, чырвонафлётцы і камандзіры знаходзілі магчымым весяліцца. Па палубах можна было чуць гармонік. Да позьняй ночы ня сьціхаў наскора організаваны хор у кают-кампаніі. Ножкі раялю для бясьпечнасьці былі адвінчаны і ён прывязаны ляжаў на палубе у гасьціннай кают-кампаніі. Седзячы перад ім па-турэцку, нярваў мазурку капэльмайстар карабельнага аркестру. Калі да ўсяго гэтага дадаць, што тут не апісана і дзесятай часткі ўсіх цяжкасьцяй і адважных па гэроізму момантаў у барацьбе з гураганам, дык аб ім даволі.


***

А поўдні 10-га сьнежня мы ўвашлі ў Брэсцкую бухту. На траверзі крэпасьці аддалі салют нацыі. Крэпасьць адказала дваццацьадным, паложаным па міжнародных правілах, выстралам, падняўшы на мачце савецкі сьцяг.

За некалькі хвілін да пастаноўкі на якар, з гавані вышаў французскі крэйсэр „Мюльгауз"—былы нямецкі крэйсэр, адабраны ад Нямеччыны па Вэрсальскаму дагавору, які адсалютаваў нам першым, на што мы адказалі роўнай колькасьцю стрэлаў.

Характэрна адзначыць, што не пасьпелі мы стаць на бочку, як французскі флёт, быўшы ў Брэсьце, увесь заруха́ўся, як усхваляваны мурaвейнік, дэманструючы нам сваю магутнасьць і рухомасьць. Зараз-ж тры караблі, якія стаялі на якары, зьняліся і вышлі ў мора. З гавані вышлі мінаносцы і сталі ў бок поўдню ад нас. Зашвэндаліся падводныя лодкі. У паветры закруціліся аэропляны, пралятаючы настолькі блізка ад нашых караблёў, наколькі гэта дазваляла адвага лётнікаў. Французы нават ухітрыліся правесьці паміж мачтамі нашага караблю прывязаны аэростат.

Адным словам, з прыходам бальшавікоў жыцьцё ў Брэсьце страціла свой „мірны" супакой. У хуткім часе на карабель прыбыў штаб-офіцэр, каб увесьці нас у курс прынятых у Брэсьце правіл, запытаць, што нам патрэбна і што яны могуць з свайго боку прадставіць. У той-жа дзень камандзір атраду тав. Галлер аддаў візыт морскаму прэфэкту Піро.



Крэйсэр „Профінтэрн"


На другі дзень стаянкі на карабель прыбыў з адказным візытам віцэ-адмірал са сьвітай. Магчыма наша вока адвыкла ад гэтых бліскучых эпалетаў расшытых золатам мундзіраў, істужак праз плячо і г. д., але паглядзеўшы на іх міжвольна прышло параўнаньне з тыпамі з нашых жывых газэт альбо дэмонстрацый.

Адмірал дагаварыўся па ўсіх пытаньнях з нашым камандзірам атраду. Былі вызначаны тэрміны рамонту і дазволена ўвайсьці ў гавань. Засталося адно маленькае „але"... Недазволілі спуску каманды на бераг. „Бачыце,—сказаў адмірал,—вас вельмі шмат, наш горад невялікі і вы запалоніце яго, тым больш, што сады зараз зачынены, а больш вам паказаць няма чаго". Апраўданьне важкае, ці-ж ня праўда? Але прадстаўнікі аднэй шостай сьвету, прадугадваючы адказ, і ня імкнуліся гаварыць на гэтую тэму, заявіўшы, што з прычыны вялікай колькасьці працы па рамонту, яны і не меркавалі злоўжываць „гасьціннасьцю" Брэсцкай улады.

Адгаворка французскага адмірала для нас была зусім празрыстай. У ёй быў наяўны страх „рэволюцыйнай вольнай" Францыі перад бальшавіцкай заразай. Ды к таму-ж, якія апраўданьні трэба было-б падшукаць для пролетарыяту Францыі пасьля вузорных паводзіць зволенай на бераг савецкай каманды, пасьля брахні французскіх і белагвардзейскіх газэт, якія малявалі бальшавікоў бандытамі? Многім газэтам прышлося-б скараціцца ў памерах. Нажаль, я не магу ўстрымацца, каб ня прывесьці кароткай вытрымкі з іх: „Францыя ёсьць Францыя, і калі чужаземцы зьвяртаюцца за нашай дапамогай, —яна ніколі ня хістаецца. Мы гасьцінны, але ці можам мы быць упэўнены, што калі французскія караблі прыдуць у Расію іх заўсёды спаткаюць таксама далікатна і элегантна". Затым ідзе ярунда аб наведаньні французскім параходам адным з чырвонаморскіх партоў, жахі ДПУ і г. д...

Гэта тое, што мы называем уціраньнем акуляраў, урад Тард'е відаць ня так моцна адчувае сябе, каб пусьціць на бераг бальшавікоў-матросаў, і імкнецца апраўдацца перад французскім пролетарыятам, выдумляючы розныя нябыліцы і хлусьню. Больш адкрыта піша часопісь: „Каманда савецкіх караблёў працягвае заставацца на барту... маючы такіх нежаданых гасьцей, ніякая асьцярожнасьць не зьяўляецца лішняй".

Так, калі такія нататкі па нашаму адрасу трэба расцэньваць, як гасьціннасьць і галянтнасьць французскае ўлады, дык мы былі прыняты і далікатна і галянтна. І што Францыя ня хістаецца мы гэта таксама ведаем. Так напрыклад, нам было прапанавана ні мала ня хістаючыся зволіць каманду на незаселеную выспу ў 7-мі кілёмэтрах ад гораду, якая прыкрывае Брэсцкі рэйд ад вятроў з акіяну, ды і то ў колькасьці ня звыш 200 чалавек. Асьцярожная Брэсцкая ўлада мабыць баялася, што на гэтай няўдзячнай глебе мы пасеем комунізм, альбо з'агітуем кароў, якія пасьвіліся на гэтай высьпе, а таму і тут паспрабавалі нас абмежаваць.



Нагляд за ворагам у часе манэўраў

ФАЛІН.

РЭДАКЦЫЯ ГАЗЭТЫ „ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА" І МЕН. АК ЛКСМБ 14 КРАСАВІКА А 7-Й ГАДЗІНЕ ЎВЕЧАРЫ

у памяшканьні Дому Комсамола

(Комсамольская вул., 25)

склікаюць АГУЛЬНА-ГАРАДЗКУЮ НАРАДУ

ўпаўнаважаных газэты „ЧЗ" і масавых працаўнікоў ячэек ЛКСМБ.

—) НА ПАРАДКУ ДНЮ: (—

1. Аб юбілею газэты „Чырвоная Зьмена".
2. Аб менскай дэлегацыі—удзельніках экскурсіі на Украіну.
3. Бягучыя справы.

Сэкратарам ячэек забясьпечыць прысутнасьць паказаных т. т. на нарадзе.

Рэдакцыя „ЧЗ" і Мен. АК ЛКСМБ.

Да ўсебеларускай экскур[сіі]

ГОМЕЛЬ-КІЕЎ-ДНЕПРАБУД

Тэрмін працягнулі, можна пасьпець

У экскурсійную камісію газэты „Чырвоная Зьмена" паступіла шэраг лістоў ад колектываў і асобных таварышоў з просьбай аб адтэрмінаваньні падачы заяў для ўдзелу ў экскурсіі па маршруту Гомель-Кіеў-Днепрабуд, а асабліва аб зьмене тэрміну ўзносу грошай у экскурсійную камісію (што і зьяўляецца галоўнай прычынай).

Экскурсійная камісія «Ч. З.», выходзячы з гэтага, тэрмін падачы заяў працягвае да 25-га красавіка.

Гэты тэрмін канчатковы. Заявы, паступіўшыя ў экскурсійную камісію пасьля 25-га красавіка, разглядацца ня будуць.

Выходзячы са зьмены тэрміну прыёму заяў, узносы грошай на экскурсію ўстанаўліваюцца наступныя—23 рублі, адначасна з заявою,—да [...] красавіка і другі, апошні ў—23 рублі, не пазьней 5-га [...]

Таварышы, якія ўжо п[...] заявы да 10-га красавіка, [...]шы дасылаюць у экскурс[ійную камі]сію ва ўстаноўленыя ране[й тэр]міны.

Заявы і грошы перасы[лаць] ў адрас: гор. Менск, К[омса]мольская, 25, экскурсійна[я ка]місія газ. „Чырвоная Зьме[на]".

Тым, хто залічаны ў [лік] экскурсантаў, будзе да[дзена] паведамленьне па пошце і, [акра]мя гэтага, у апошніх [днях] красавіка месяца будзе [надру]шчаны поўны склад экску[рсан]таў-дэлегатаў у газэце [„Чыр]воная Зьмена".

Экскурсійная камісія «Чырв. Зьмена».

Паштовая скрынка

Кэпніку—„Все-ли здесь благополучно", Фабзайцу—„Зрабіць выпуск ударным", Брэльгіну—„Дрэнная праца",—Рандзе—„Прачнецеся", „Няма сталай адміністрацыі", Падглядаеву—„Тут ня ўсё добра", Рыгору Ц. — „Бярэце прыклад", Адзінокаму—„Пара", Юнкору—„Дэзэртыры з фронту колектывізацыі і іх абаронцы", Рокашу—„Наша праца ў кашальку", Пчолцы—„Хто абараняе кулакоў", Гаўрыленку—„Нецатрэбна такіх у комсамоле", Расіінду—„Кулак-шовініст", Дубку—„Нядбайныя адносіны", Качуру—„Зьвярнеце ўвагу", Качарзе—„Ад каго можа пашырацца антысэмітызм", Якероону—„Сьвержань, Рагачэўскага раёну", Булаўцы—„Узяліся за вучобу", Хрытанкову—„Дапамажэце", Бабылю—„Перагібы па поваду артыкулу тав. Сталіна аб колгасе" Ларывановічу—„Прапойская профмайстэрня", Фрыду — „А дзе-ж другі і трэці нумар", Цыральсону—„Зьнізу паджарана, а ў сярэдзіне...", Невяроўскаму—„Мы не адстаем", Чаборыку—„Гора—працаўнік—Шыфрыну—„Дзьве-тры многа", „На тактычных занятках", Юнкору М. К.—„Прыняць захады", Культурнаму—„Валакіта", Анісенкаву—„Ліст у рэдакцыю", Хмарцы—„Там, дзе няма парадку", Васе Бураму—„Дапамога беднаце", Палітыку—„Дзе люстра школы", Школьніку—„З Менску ў Магілеўшчыну ў 5 дзён", Вучню—„Мясцовы савет, прымі пад увагу", Ведаючаму—„Сяляне пад комсамольскім варожым уплывам адносна колектывізацыі", Гарбацэвічу—„Зьвярнуць увагу", Фаміну — „Пазбаўленец у колгасе", Мільчэнку — „Што робіцца на абутковай фабрыцы", Бараво́му — „Зрабеце ўмовы для працы", Амельчанкаву—„Нашы дасягненьні ў працы", Грале — „Зьбіраем лом і ўтыль", Гэльфанду—„Сабралі сыравіну", Бім-бому—„На сьметніку валяюцца грошы", „Дайце доктара", Гошку—„Бяз бутэлькі ня ўзяць", „Выхаваньне дзяцей у Кастрычнікавай школе", Юнкору—„Ня прымаў пад увагу", Калючку—„Лекцыі фізвыху і ваенізацыі адсутнічаюць", Пыліле—„Удзел вучняў Клічэўскай сямігодкі ў політычна-гаспадарчых камісіях", Шванкаву—„Варожых элемэнтаў вон са школы", „Толькі пляны і пастановы", Ленчыкаву—„Адносіны комсамольца Зайца да колектывізацыі", Маўчкову—„Каго яны рыхтуюць? Рыбіну—„Б'ём трывогу". Вашы допісы друкавацца ня будуць. Дайце ў насьценгазэту.

Сябру КСМ—„Цаганіна ў кіруючых органах комсамолу", Сіротку—„Няма часу", Макарэнку—„Ліст у рэда[кцыю]", Ведаючаму—„За што выключ[ылі з] комсамолу", Уласаву і Лявоши[ну—„...] расьцярога", Веткі палявыя—„[...] гэтак будзе", Ежу—„Ліст у рэда[кцыю]", Пчале—„Гастралёр", Юнкору [...] „Пад сукном 9 месяцаў", Сел[...] „Абаронцы падкулачнікаў", Са[...] „Ухілу і ўхілісту няма месца [...]цы комсамолу", Лютчын Якаву [...]яцца самакрытыкі і ці́рыдушаю[ць...] Філіповічу—„Не па комсамоль[ску...] па гандлярску", Юнкору—„Раск[...] бюро ячэйкі", Маханькову—„З[...] комсамолец Захараў атрымаў вы[...] Арму—„За што мне далі вымо[ву]", [...]онавічу—„Калі будзе сход [...]" Палыню—„Вон з комсамолу [...] клясавага ворага", Рапушнову[—„...] гонім компашку", Ш.—„Был[...]дыт на чале колгасу", Шып[...] „Трэба аздаравіць працу біб[...]" Сыскаўцу—„Ці доўга гэтак [...]" Асаку—„Вось дык комсамол[...]" „Блужская ячэйка не працуе", [...]ою—„Беспарадкі". Дзергачу — [...]ныя справы ў ячэйцы ЛКСМ Ж[...] Харыку—„Калі гэтаму будзе [...]" Гэтыя допісы накіраваны ў а[дпавед]ныя ўстановы на расьледваньн[е і пры]няцьця належных захадаў.

Паведамленьні

МенАК ЛКСМБ катэгарыч[на прапа]нуе не пазьней 15 красав[іка] слаць у АК ЛКСМБ ячэйкам: [„Ка]мунар", „Белдзяржбуд„, [...]ная фабрыка, мэталістых—са[...] ДЭТ, будаўнікоў—саюзная, [...]на-адукацыйных курсаў, пэд[...] Меншвэй, двух харчавых за[...] галянтарэйная фабрыка, [...]нал, групком харчавікоў, [...]лектыў краўцоў, профшкола [...]цоў, політэхнікум, польпэ[...]кум, Белпэдтэхнікум. Акрфа[...] камгандлю, Працасьветы, Бе[л...] кіно, Белдзяржтэатру, Розьм[...]сэмбург, Лекерта, Лошыцы [...] гараднага сельсавету, сьпі[сы] членаў і кандыдатаў ячэек [па на]ступнай форме:

Прозьвішча, імя і імя па [бацьку], № комсамольскага білету, [з якога году ў] КСМ, год нараджэньня.

У выпадку недасылкі сь[пісаў к] вышэйпамянёнаму тэрміну, [справа] будзе разглядацца сэкратар[ыятам] МенАК, і сэкратары вышэй[памянё]ных ячэек пэрсанальна [будуць] адказваць за недасылку сь[пісаў].

Ад нашага гомельскага корэспондэнта

Рабочы комсамолец— вылучэнец

Комсамолец рабочы заводу імя Ланцуцкага (Гомель) тав. Аляксандраў, высунуты на пасаду загадчыка юнсэкцыі Біржы Працы, ён-жа будзе і намесьнікам загадчыка оргаддзелу акругкому комсамолу і прадстаўніком ад комсамолу акрпрофбюро. Тав. Аляксандраў 6 год працуе ў варштата; у комсамоле—з 1924 г.

Пабудуем падводную лодку

У Гомельскай акрузе ідуць зборы на пабудову падводнай лодкі імя Комсамолу. Гомельскі чыгуначны ФЗВ унёс 70 рублёў, сабраных паміж вучнямі. Акрамя гэтых 70 рублёў, вучні рашылі адлічыць яшчэ па поўпрацанта.

У Гомельскім сельскім раёне Брылеўская комсамольская ячэйка сабрала на пабудову падводнай лодкі 60 руб.

Яромінская ячэйка сабрала 15 р., ячэйка кон. заводу—30 рублёў, комсамольцы Жакт'у імя Горкага сабралі 230 кілёграм жалезнага лому і выручаныя грошы ў суме 3 р. 90 кап. перадалі ў фонд пабудовы падводнай лодкі імя комсамолу.

ГОМЕЛЬ. 11. Прэзыдыум ОПБ пастанавіў усе сродкі, атрыманыя ад збору металёвага лому і ўтыльсыравіны, перадаць у фонд індустрыялізацыі краіны.

ГОМЕЛЬ, 11. У Гомелі дрэнна абстаіць справа з ваенізацыяй, з ТСА-авіахэмаўскай работай. Многія комсамольскія ячэйкі ня лічаць ваенную работу сваёй комсамольскай работай, а аб профсаюзах і гаварыць няма чаго,—яны ахоплены лётаргічным сном.

ГОМЕЛЬ 12. Акруговая ашчадкаса прыступае да правядзеньня опэрацый па безнаяўных разьліках. У першую чаргу мяркуецца, як вопыт, правесьці опэрацыю па прыему мясцовых падаткаў і пакупкі кніг у крэдыт шляхам безнаяўных разьл каў.

ГОМЕЛЬ 11. У бліжэйшы час склікаецца акруговы зьлёт ТСА-Авіахэмаўскіх каманд. На зьлёце будуць падагуліваць працу мінулага зімняга пэрыоду і вырашаць пытаньне аб пераходзе на лягерную работу.

ГОМЕЛЬ 12. У большасьці комсамольскіх ячэек Гомелю дрэнна абстаіць справа з беларусізацыяй. У некаторых ячэйках існуе яшчэ аполітычнасьць і безадказнасьць у справе беларусізацыі.

ФРУНЗЭНСКІ РК ЛКСМБ.—14-га красавіка, а 6-й гадзіне ўвечары, ў памяшканьні Дому Комсамолу адбудзецца нарада апоргаў, упаўнаважаных па „Чырвонай Зьмене" і масавікоў усіх ячэек Фрунзэнскага раёну.

„Чырвоная Зьмена" дапамагла

— У „Чыр. Зьм." № 47 быў зьмешчаны артыкул пад назвай: „Выбрык супроць самакрытыкі", у якім пісалася, што пры Глускім райвыканкоме (Бабруйская акруга) быў выпушчан спэцыяльны нумар насьценгазэты, прысьвечаны чыстцы савецкага апарату, у якім прадзёрнулі бухгальтара Дашкевіча, справавода Рудштэйна і інш. Пасьля гэтага пакрыўджаныя зрабілі сход, ініцыятарам якога была комсамолка Шпакоўская. Па заметцы прыняты належныя захады. Комсамолка Лебніц, якая ўзьняла гэтае пытаньне, выключана з комсамолу, іншыя атрымалі вымовы.

— У Мазырскі АК РСІ была накіравана заметка для прыняцьця належных захадаў, у якой пісалася, што нейкі Бранц, працуючы ў Петрыкоўскім дзяржсындыкаце скарыстаў сваё службовае становішча і гандляваў далярамі на чорнай біржы і інш. Заметка была скарыстана пры чыстцы савапарату і Бранц зьняты з працы па першай катэгорыі з забаронай працаваць у савецкіх установах, грамадзкіх організацыях і прадпрыемствах СССР.

— У газэце „Чырвоная Зьмена" № 286 была зьмешчана заметка аб тым, што ў Гомельскім ФЗВ творацца бясчынствы. Па заметцы прыняты неабходныя захады. Два інструктары зьняты з працы.

Адказны рэдактар [...]
Рэдкале[гія]

Менск, друкарня БДВ. Галоўлітбел № 599